Устрашенный потерями, которые несла французская армия в результате малой войны, Наполеон нервничал. Именно действия партизан не давали ему покоя. Лористон (Жак Александр Бернар Ло – посол Франции в России в 1811 г.), которого послал Наполеон к М.И. Кутузову выпрашивать мир, говорил о том, что против французов идет война не по правилам, «варварская война». Куда бы не ступали войска Наполеона везде стоял преградой вооруженный народ и партизанские отряды, которые наносили неожиданные удары по французам.

Следует сказать, что партизаны не стояли на одном месте, а постоянно находились в движении. Порой никто, кроме командующего не знал, куда отряд направится в следующую минуту. Их действия были внезапны и стремительны. Основное правило партизан было – молниеносно налететь и также быстро скрыться. Чаще всего партизанские отряды устраивали засады и нападали на противника в пути, захватывали курьеров и освобождали русских пленных.

Война 1812 г. показала, что воевать небольшой армией уже было нельзя. В войне стали участвовать массы людей, от «организованности и состояния духа которых зависел весь ход и исход войны» [1, с. 608]. Наполеон не верил в возможность народной войны, которая наиболее сильно проявила себя в партизанском движении и заплатил за это слишком дорогую цену. Партизанская или малая война сыграла стратегическую роль в победе России, ещё раз доказав, что русская земля никогда не обеднеет героями, готовыми до последней капли крови отстаивать свободу своего Отечества.

1. Бескровный, Л.Г. Отечественная война 1812 года / Л.Г Бескровный. – М., 1962.
2. Ленин, В.И. Сочинения / В.И. Ленин. – Т. 31, 5-е изд. – М., 1967.
3. Ожегов, С.И. Словарь русского языка / С.И. Ожегова. – М., 1987.
4. Энциклопедия Аванта Плюс. История России. – Изд. 5-е. – Т. 2. – М., 2000.

**А.Р. Агееў**

## ПАРТЫЗАНСКІ РУХ 1812 ГОДА НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ: АНАМАЛІЯ ЦІ ЗАКАНАМЕРНАСЦЬ?

З самага пачатку вайны тэрыторыя Беларусі стала арэнай баявых дзеянняў. Цяжар вайны лёг на плечы беларускага народа, які стаў заложнікам і ахвярай заваёўніцкіх планаў і палітычных амбіцый кіраўніцтва Францыі і Расіі. Напалеон з асноўнымі сіламі рушыў на Маскву, а на тэрыторыі Беларусі засталіся шматлікія гарнізоны і больш чым 100 тысячнае войска. Большая частка беларускіх зямель кантралявалася французамі. Пад прыкрыццём карпусоў Вітгенштэйна і Эртэля пад кантролем расіян засталася паўночная частка Віцебскай губерні ды на поўдні паветы Ўсходняга Палесся (частка Мінскай і Магілёўскай губерняў).

У літаратуры доўгі час лічылася натуральным, што беларускі народ расійскую армію ўсяляк падтрымліваў, а супраць французаў ўзняўся на барацьбу. Нагадаем тыповы для расійскай і савецкай гістарыяграфічнай традыцыі пункт гледжання: “Насельніцтва Беларусі сустрэла іншаземных прышэльцаў як сваіх занявольнікаў і непрымірымых ворагаў і аказала ім мужнае супраціўленне… Сяляне хавалі маёмасць, кідалі свае хаты… Сыходзілі ў глыбіню глухіх лясоў, ганяючы з сабою скаціну. На ўсёй прасторы Беларусі вораг сустракаў спусцелыя, а часам і спаленыя вёскі. Многія жыхары гарадоў сыходзілі ў глыбіню краіны разам з рускімі войскам” [3, с. 33]. Такія погляды у змякчэлай форме прапагандуюцца некаторымі аўтарамі і сёння, але існуюць і іншыя меркаванні.

Як жа ставілася насельніцтва Беларусі да французскай і расійскай армій? Ці разгарнуўся на Магілёўшчыне масавы партызанскі рух?

Репозиторий ВГУ

Вялізарныя патрэбы Вялікай арміі былі несувымерныя з магчымасцямі краіны. Неўзабаве насельніцтва зразумела, што французская ўлада для простага люду не лепей за рускую. І тая, і другая прымушалі працаваць на пана, плаціць непасільныя падаткі і выконваць цяжкія павіннасці. Сялянства прыняло на сябе асноўны цяжар ваенных паставак, што не магло не выклікаць яго пасіўнага ці актыўнага супраціўлення. Тым не менш, пацвярджэнняў традыцыйным разважанням аб моцным сялянскім руху ў крыніцах не бачна, нават на ўсходзе Беларусі, які на чвэрць стагоддзя раней, чым захад краіны, увайшоў у склад Расіі.

У наваколлі Магілёва больш-менш значныя сялянскія партызанскія атрады былі толькі ў паўночна-заходняй частцы сучаснага Бялыніцкага раёна. Жыхары вёсак Кляўкі, Стараселле, Эсьмоны сем'ямі, з жывёлай, сыходзілі ў лясы і балоты, якіх хапала ля вёсак. Арганізаваўшы атрады самааховы, яны з цягам часу, пачалі нападаць на французскія каманды і маёнткі мясцовых памешчыкаў. Для навядзення парадку сюды нават быў накіраваны карны атрад [4, 41]. Але гэты "партызанскі" край знаходзіўся у Мінскай губерні. У Магілёўскай губерні не выяўлена партызанскіх атрадаў, якія б ваявалі з французскімі ўладамі.

Адкуль жа ўзялася міфалагема аб моцным партызанскім руху? Яна стала вынікам інтэрпрэтацыі аднаго бясспрэчнага факта – хваляванняў беларускага сялянства. Справа ў тым, што пасля пачатку вайны шырокія памеры прыняла антыфеадальная барацьба сялянства на тэрыторыі Беларусі. Хваля моцных выступленняў пракацілася і па Магілёўскай губерні. Сяляне выкарысталі бязладдзе ваеннага часу для ўзмацнення барацьбы з панамі.

Ігумен Арэст сведчыў, што ў Магілёўскай губерні "сяляне … адмаўляліся ад выканання сялянскіх павіннасцей … не адбывалі работ і прыгонаў … у самы рабочы летні час прыпыніліся ўсе палявыя і лугавыя справы …". Архірэйскія сяляне разрабавалі Барсукоўскі архірэйскі фальварак: свіраны разбілі, хлеб раскралі, разабралі некалькі бочак гарэлкі з вінакурні і з свіраноў, цягнулі яе вёдрамі, гарлачамі, гаршкамі – хто чым мог, разабралі жывёлу і птушак. Гэты факт у свой час падаваўся як акт помсты архірэю за здрадніцтва Радзіме. Але такія ж выступленні былі і ў памешчыкаў, і ў гарадах, дзе рабавалі і кабакі, і лаўкі. Магілёўскі губернскі маршалак дваранства пісаў пазней: "Сяляне аддаваліся хваляванню… , рабілі рабункі… , раскрадалі маёмасць і ў рэшце,апошняе імкненне зрабілася па ўсёй губерні агульным". Але неўзабаве па гарадах і мястэчках Магілёўскай губерні (як і іншых губерняў) былі разасланы ваенныя каманды пад назвай "Ochrana". Невялікія атрады размяшчаліся ў фальварках па просьбе памешчыкаў і Магілёўскага архірэя дзеля навядзення парадку і аховы ад рабункаў рэгулярных злучэнняў французскай арміі, якая рухалася праз Магілёўшчыну. Складалі іх, як правіла, выхадцы з Польшчы, Беларусі, Літвы. "Ахова" хутка прывяла сялян у "паслухмянасць і падпарадкаванне". Каманды вялі сябе прыстойна, масавых рабункаў не дапускалася. Нават расійскія крыніцы прызнаюць, што гэтаму ў немалой ступені спрыялі мясцовыя "камісіі польскага праўлення". Яны пераконвалі каманды ўтрымлівацца ад рабункаў і гвалту, каб не абудзіць агульнага паўстання праваслаўных"[1, с. 54–56]. Якія б не былі мэты, але пэўны парадак даволі хутка ўсталяваўся.

Доўгі час антыфеадальную барацьбу беларускага сялянства звязвалі з нацыянальна-вызваленчай барацьбой беларускага народу супраць французскіх акупантаў. Антыпрыгонныя выступленні разглядаліся, як барацьба беларускіх сялян супраць польскіх памешчыкаў, якія здрадзілі і падтрымлівалі французаў. На картах вайны 1812 г. раёны сялянскіх хваляванняў пазначаліся як раёны дзеянняў партызанскіх атрадаў (адзначым, што ў некаторых выпадках гэтыя раёны са-

Рэпазіторый БДУ

праўды супадаюць). Былі і іншыя меркаванні. Многія заходнія даследчыкі адзначалі антыпрыгонныя настроі сялянства, але барацьба з французамі, на іх думку, ішла пераважна за матэрыяльныя інтарэсы сялян. Расійскія вучоныя крытыкавалі іх за тое, што барацьбу сялян за Радзіму зводзяць да барацьбы за курэй, авечак і г.д., падкрэслівалі патрыятычныя настроі, не прыводзячы, праўда, пераканаўчых доказаў.

Даследаванні апошніх гадоў паказалі, што адназначна звязваць антыфеадальную і нацыянальна-вызваленчую вайну даволі праблематычна. Ніяк нельга абыходзіць той факт, што сялянскі рух назіраўся на тэрыторыі занятай як французскай, так і рускай арміямі. Расійскія генералы Вітгенштэйн (на поўначы Беларусі) і Эртэль (на поўдні) мелі праблемы ў сувязі з сялянскімі хваляваннямі. Ужо 8 жніўня Віцебскі віцэ-губернатар даносіў Вітгенштэйну, што ў Полацкім, Гарадоцкім, Невельскім паветах сяляне не выконваюць загадаў расійскіх памешчыкаў. Карныя каманды ўціхамірвалі хваляванні сялянства. Падобнай была і сітуацыя ў Смаленскай губерні: у пачатку кастрычніка прасілі даслаць каманды для ўціхамірвання сялян улады Веліжскага і Суражскага паветаў. Па загадам Вітгенштэйна карнікі расстрэльвалі і вешалі завадатаяў хваляванняў у Віцебскай і Пскоўскай губернях. Вымушаныя былі пасылаць карныя войскі супраць сялян Падмаскоўя і Смаленшчыны Барклай дэ Толі, Кутузаў. Увогуле ж, антыпрыгонныя выступленні сялян ахапілі ў 1812 г. 32 губерні Расіі і хваляваліся сяляне ў губернях, далёкіх ад тэатра ваенных дзеянняў (Саратаўскай, Пермскай, Арэнбургскай, Валагодскай).

Прычыны росту антыфеадальнай барацьбы беларускіх сялян бачацца ў тым, што імкненне сялян да волі, якое назіралася і раней, спалучылася ва ўмовах вайны з шэрагам іншых фактараў. У сувязі з ваеннымі дзеяннямі адбывалася часовае аслабленне грамадзянскай улады. Вайна выклікала рэзкі рост расійскіх падаткаў і павіннасцяў. І расійскія і французскія інтэнданты займаліся нарыхтоўкай фуражу і прадуктаў харчавання. Дапамагалі ім у гэтым мясцовыя памешчыкі. Усё гэта, плюс марадзёрства, рэзка пагоршыла становішча сялян. Сялянскіх бунтаў баяліся памешчыкі, як беларускіх, так і вялікарускіх губерняў, чаму шмат сведчанняў.

Але, напэўна галоўнай прычынай масавых хваляванняў сялян было чаканне вызвалення ад прыгоннай залежнасці. Яно вельмі часта звязвалася з прыходам Напалеона. Яшчэ ў 1806–1807 гг. Распаўсюдзіліся чуткі аб намерах Банапарта адмяніць прыгоннае права ў Расіі, як ён гэта зрабіў у 1807 г. ў Польшчы. Паўсюдна хадзілі пагалоскі аб вызваленні сялян ад прыгону. Адны іх звязвалі з указамі імператара Аляксандра, іншыя – з дэкрэтамі імператара Напалеона. Чуткі рэзка актывізавалі сялянства. Жадаў таго Напалеон, ці не, але яго армія на тэрыторыі Расіі разносіла антыпрыгонныя настроі У некаторых мясцовасцях мелі месца нават сумесныя выступленні сялян і французскіх салдат. У Полацкім павеце Віцебскай губерні, у шэрагу паселішчаў Смаленскай, Маскоўскай губерняў, з ліпеня па верасень тутэйшыя сяляне грамілі панскія сядзібы з дапамогай французскіх салдат.

Каб зразумець карані спрэчак, якія сёння вядуць гісторыкі, трэба мець на ўвазе супярэчлівае становішча французскай і рускай арміі ў гэтай вайне. З аднаго боку армія Напалеона – гэта армія захопу, чужая армія. Іншая мова, вопратка, паводзіны, часам рабункі – усё гэта не магло не выклікаць варожасць тутэйшага насельніцтва да яе. Рабаванне французаў красамоўна апісана ў літаратуры. Яны вымушаныя былі збіраць харчаванне на Беларусі і гэта выклікала незадаволенасць. Існавала, як і ў іншых арміях, марадзёрства, якое адштурхоўвала мясцовае насельніцтва.



Репозиторий ВГУ

З другога боку, французская армія – гэта рэвалюцыйная армія. Яе салдаты неслі ідэі французскай рэвалюцыі. Гэта была масавая армія буржуазнага тыпу, якая не ведала каставых бар’ераў паміж салдатамі і афіцэрамі. Яна можа і між волі прапагандавала ідэі “свабоды, роўнасці, братэрства”. Многія сяляне чакалі ад яе вызвалення ад прыгону. Адсюль выцякаюць і розныя адносіны да арміі Напалеона ў розных колах, у розныя часы, у розных мясцінах.

Даволі моцным быў партызанскі рух ля Віцебска. Напалеон нават вымушаны быў сюды паслаць падмацаванне. Але тут дзейнічалі партызанскія кавалерыйскія атрады з корпуса Вітгенштэйна. Па вялікаму рахунку, партызаны на Беларусі, асабліва на другім этапе вайны, – гэта перш-наперш конныя атрады расійскай арміі, якія дзейнічалі аўтаномна на флангах і ў тылу арміі Напалеона. Уласна кажучы, у 1812 г. было два партызанскія рухі – армейскі і сялянскі, якія трэба вызначаць і адрозніваць. У верасні ў складзе армейскіх партызанскіх атрадаў дзейнічала 36 казацкіх, 7 кавалерыйскіх, 5 пяхотных палкоў, 5 эскадронаў, 3 батальёна. Армейскія партызанскія атрады ігралі не толькі ваенную, але і карную ролю. Яны падпарадкоўвалі расійскаму ўраду народныя нізы, якія знаходзіліся на занятай непрыяцелем тэрыторыі. Дзеля гэтага часцяком партызанам прыходзілася прымяняць сілу і меры запалохвання.

Відавочна, што народны партызанскі рух на Беларусі (у тых мясцінах, дзе ён існаваў) быў значна слабейшы, чым у рускіх расійскіх землях. У Смаленскай, а затым Маскоўскай і Калужскай губернях сялянскія партызанскія атрады ўяўлялі небяспеку для французаў. На Беларусі няма і гаворкі аб тысячных партызанскіх атрадах, тысячах партызан у адным павеце і г.д. Як лічаць многія расійскія гісторыкі, шырокае народнае супраціўленне французы пачалі сустракаць галоўным чынам пасля Смаленска, калі ўступілі ў рускія землі. Аб тым жа сведчаць і мемуары французаў.

Такім чынам, на тагачаснай Магілёўшчыне па сутнасці адсутнічаў партызанскі рух. А на абшарах Беларусі барацьба сялянскіх партызанскіх атрадаў на Беларусі не дасягнула памераў партызанскай вайны. Аналіз формаў барацьбы беларускіх партызан паказаў, што большай часткай гэтая барацьба абмяжоўвалася хаваннем ў балотах і лясах жывёлы, закопваннем хлеба ў ямах… Па сутнасці, сяляне вялі барацьбу за выжыванне сваіх сямей ва ўмовах вайны. Аб’ектыўна барацьба беларускіх сялян за хлеб дапамагала расійскай арміі, бо замінала правядзенне нарыхтоўчых мерапрыемстваў французскіх інтэндантаў. Але і перабольшваць яе значэнне не варта. Харчовыя магазіны французаў у восень 1812 г. былі поўныя. Тым больш цяжка назваць гэты рух нацыянальна-вызваленчым. Сяляне ў большасці бераглі сваю маёмасць, а не ваявалі з французамі. Яны ўцякалі ў лясы ад вайны, пабораў, рабункаў і марадзёраў. Падобная сітуацыя назіралася на большай частцы беларускіх зямель, якія былі занятыя французскімі войскамі.

1. Агееў, А.Р. Магілёўшчына пад час вайны 1812 года / А.Р. Агееў // Магілёўская даўніна. –1995. – с. 51–60.
2. Записки игумена Ореста // Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. – Т. 2. – Вильна, 1867. — С. LXXIX—XCVII.
3. Карнейчык, К. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года / К. Карнейчык. – Мн.,1962.
4. Палонік, Н. Сялянства Бялыніцкага раёна ў час вайны 1812 г. / Н. Палонік // Прыдняпроўе. – Магілёў, 1993. – с. 40–41.

Рэпазіторый ВДУ